## Асноўныя формы дзеяслова (паўтарэнне)

Дзеяслоў мае чатыры асноўныя формы:

| Асноўная форма | I спр. | II спр. | III спр. | IV спр. | — |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. Praesens indicatīvi actīvi, 1 *sg.* | laudo | doceo | scribo | audio | sum |
| 2. Perfectum indicatīvi actīvi, 1 *sg.* | laudāvi | docui | scripsi | audīvi | fui |
| 3. Supīnum | laudātum | doctum | scriptum | audītum | — |
| 4. Infinitīvus praesentis actīvi | laudāre | docēre | scribĕre | audīre | esse |
| Пераклад | *хваліць* | *вучыць* | *пісаць* | *слухаць* | *быць* |

З а ў в а г і.

1. Замест чацвёртай асноўнай формы ў слоўніку звычайна прыводзіцца нумар спражэння: scribo, scripsi, scriptum, 3 і г. д.

2. Некаторыя дзеясловы могуць не мець другой або трэцяй асноўнай формы. Напрыклад, дзеяслоў sum — *быць*, дзеясловы, вытворныя ад sum, некаторыя іншыя дзеясловы не маюць трэцяй асноўнай формы.

## Асновы дзеяслова

Па асноўным формам вызначаюцца тры дзеяслоўныя асновы:

1) асноўа infectum вызначаецца па 1-й асноўнай форме. У I спражэнні канчатак -**o** замяняецца на **ā**, у астатніх спражэннях канчатак -**o** адкідваецца;

2) аснова perfectum вызначаецца па 2-й асноўнай форме шляхам адкідвання канчатка -**i**;

3) аснова supīnum вызначаецца па 3-й асноўнай форме шляхам адкідвання канчатка -**um**:

| Асноўная форма/ аснова | I спр. | II спр. | III спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|---|
| 1-я асн. форма | laudo | doce-o | scrib-o | audi-o |
| Аснова infectum | laudā- | docē- | scrib- | audī- |
| 2-я асн. форма | laudāv-i | docu-i | scrips-i | audīv-i |
| Аснова perfectum | laudāv- | docu- | scrips- | audīv- |
| 3-я асн. форма | laudāt-um | doct-um | script-um | audīt-um |
| Аснова supīnum | laudāt- | doct- | script- | audīt- |
| 4-я асн. форма | laudā-re | docē-re | scrib-ĕre | audī-re |
| Аснова infectum | laudā- | docē- | scrib- | audī- |

З а ў в а г а. Таксама аснову infectum можна вызначаць па 4-й асноўнай форме шляхам адкідвання суфіксаў -**re**/-**ĕre**.

## Стандартныя і нестандартныя дзеясловы

Стандартнымі называюцца дзеясловы, якія ўтвараюць аснову perfectum ад асновы infectum з дапамогай суфікса -**v**-, аснову supīnum — з дапамогай суфікса -**t**-:

| 2-я асн. форма | 3-я асн. форма |
|---|---|
| **Аснова infectum + v-i** | **Аснова infectum + t-um** |

Напрыклад, laudo, laudāvi, laudātum, 1; audio, audīvi, audītum, 4. Для стандартных дзеясловаў у слоўніку прыводзіцца толькі 1-я асноўная форма і нумар спражэння: laudo, 1; audio, 4.

Практычна пры ўтварэнні асноўных форм стандартных дзеясловаў да 1-й асноўнай формы дабаўляюцца наступныя канцавыя элементы:

| Асн. форма | I спр. | II спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|
| 2-я | **āvi** | **ēvi** | **īvi** |
| 3-я | **ātum** | **ētum** | **ītum** |
| 4-я | **āre** | **ēre** | **īre** |

Астатнія дзеясловы называюцца нестандартнымі: doceo, docui, doctum, 2; scribo, scripsi, scriptum, 3.

## PERFECTUM INDICATIVI ACTIVI

Perfectum indicatīvi actīvi (прошлы час закончанага трывання абвеснага ладу незалежнага стану) адказвае на пытанне *што зрабіў?* Утвараецца ад асновы perfectum з дапамогай асабовых канчаткаў perfecti:

| Аснова perfectum | + | асабовыя канчаткі perfecti |
|---|---|---|

**Асабовыя канчаткі perfecti**

| Асоба | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| 1-я | **i** | **ĭmus** |
| 2-я | **isti** | **istis** |
| 3-я | **it** | **ērunt** |

**Узор спражэння**
**laudo, āvi, ātum, 1 (аснова perfectum: laudāv-);**
**scribo, psi, ptum, 3 (аснова perfectum: scrips-)**

| Асоба | laudo, 1 — *хваліць* | scribo, 3 — *пісаць* |
|---|---|---|
| | Singulāris | |
| 1-я | laudāv-**i** | scrips-**i** |
| 2-я | laudav-**isti** | scrips-**isti** |
| 3-я | laudāv-**it** | scrips-**it** |
| | Plurālis | |
| 1-я | laudav-**ĭmus** | scrips-**ĭmus** |
| 2-я | laudav-**istis** | scrips-**istis** |
| 3-я | laudav-**ērunt** | scrips-**ērunt** |

**Perfectum indicatīvi**
**дзеяслова sum, esse — *быць* і вытворных**

Утвараецца гэтаксама, як у правільных дзеясловаў:

| Асоба | sum, fui, —, esse *быць* | absum, afui, —, abesse *адсутнічаць* | possum, potui, —, posse *магчы* |
|---|---|---|---|
| | Singulāris | | |
| 1-я | fu-**i** | afu-**i** | potu-**i** |
| 2-я | fu-**isti** | afu-**isti** | potu-**isti** |
| 3-я | fu-**it** | afu-**it** | potu-**it** |
| Plurālis | | | |
| 1-я | fu-**ĭmus** | afu-**ĭmus** | potu-**ĭmus** |
| 2-я | fu-**istis** | afu-**istis** | potu-**istis** |
| 3-я | fu-**ērunt** | afu-**ērunt** | potu-**ērunt** |